# УДЗЕЛ ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА Ў АДНАЎЛЕННІ ІРАКА І ПАЗІЦЫЯ ЗША

**І. М. Аўласенка**

Глыбокія супярэчнасці паміж членамі трансатлантычнай супольнасці праявіліся не толькі напярэдадні і пад час ваеннай аперацыі ў Іраку 2003 года, але і ў працэсе аднаўлення краіны. Яны захоўваліся, пакуль не быў вызначаны такі фармат удзелу еўрапейскіх краін, які задавальняў кожную з іх. Галоўнай мэтай дадзенага даследвання з’яўляецца як спроба прасачыць працэс урэгулявання ў Іраку, так і ацаніць ступень уцягнутасці ў гэты працэс Еўрапейскага саюза на працягу першых гадоў пасля ваеннай аперацыі. У даследванні разглядаюцца 2003–2005 гг., калі непасрэдна ішлі дыскусіі і фарміравалася ўяўленне аб фармаце ўдзелу еўрапейскіх краін у аднаўленні Ірака. Актуальнасць гэтай тэмы вызначаецца і тым, што яна дапамагае прааналізаваць палітыку ЕС на Блізкім Усходзе ў цэлым і пазіцыю ЗША ў дачыненні да яе.

Еўрапейская супольнасць не змагла выпрацаваць адзіную пазіцыю ў адносінах да іракскай кампаніі, таму фактычна раскалолася на дзве групы дзяржаў, першыя з якіх падтрымлівалі амерыканскую лінію ў адносінах да Ірака (Вялікабрытанія, Нідэрланды і іншыя), а другія (Францыя, Германія) – не. Гэта ж праявілася ў дачыненні да пытання аб аднаўленні Ірака. На працягу першых гадоў адзінай пазіцыі ўсіх краін ЕС па іракскай праблеме сфармулявана не было. Таму выразна прасочваліся як лініі палітыкі асобных краін, так і Еўрапейскага саюза ў цэлым ад імя Еўракамісіі і Савета ЕС, якія прадстаўлялі кампрамісную пазіцыю па многіх пытаннях.

Першым пытаннем, якое паўстала перад ЗША і краінамі ЕС, было пытанне аб фінансавай дапамозе дзяржаве, якая пацярпела ад баявых дзеянняў. Ужо ў кастрычніку 2003 года ў Мадрыдзе адбылася першая канферэнцыя краін-донараў, якія пажадалі матэрыяльна дапамагчы аднаўленню Ірака. Але выявілася відавочная асіметрыя ў прадстаўленых сумах. У той час як Злучаныя Штаты выдаткавалі каля 18 млрд. долараў, Еўрапейскі саюз змог вылучыць толькі 1,25 млрд., з іх 200 млн. былі выдаткаваныя Еўрапейскай камісіяй. Францыя адмовілася вылучыць нейкую суму, дэманструючы свой скепсіс адносна ўсіх гэтых падзей. Наадварот, Вялікабрытанія прапанавала каля 1 млрд. на аднаўленне краіны [6].

Тым не менш, Еўрапейскі саюз імкнуўся развіваць адносіны з Іракам у рамках наладжвання кантактаў з усімі дзяржавамі блізкаўсходняга рэгіёну. Пра гэта сведчыць тое, што яшчэ ў чэрвені 2004 года была выпушчана дэкларацыя, якая анансіравала пашырэнне ўзаемных кантактаў, а ў перспектыве – далучэнне Ірака да еўрапейскіх праграм

партнёрства з рэгіёнамі Міжземнамор’я і Блізкага Усходу [1]. Гэтаму паспрыяла відавочнае нежаданне ЕС поўнасцю аддаваць кантроль над сітуацыяй у краіне ў рукі амерыканцаў, а таксама імкненне павялічыць свой уплыў у гэтай краіне і блізкаўсходнім рэгіёне ў цэлым. Акрамя таго, наладжванне адносін з Іракам было неабходным і святле магчымага будучага пашырэння ЕС за кошт Турцыі, у выніку чаго супольнасць мела б з Іракам агульную мяжу.

Пад час саміту ЗША – ЕС у Ірландыі ў чэрвені 2004 года ўздымалася пытанне аб фармаце ўдзелу абодвух бакоў у аднаўленні Ірака. Бакі выпусцілі дэкларацыю «ў падтрымку насельніцтва Ірака». Яна з’явілася кампрамісным дакументам. У ёй знайшоў адлюстраванне намер прыцягнуць ААН да рэканструкцыі дзяржавы пасля аднаўлення яе суверэнітэту. Акрамя таго, у дэкларацыі давалася размежаванне абавязкаў ЗША і ЕС ў дачыненні да Ірака: на амерыканцаў ускладвалася забеспячэнне насельніцтва электрычнасцю, вадой, умовамі для аховы здароўя; на еўрапейцаў ускладвалася задача ўмацавання цывільнага грамадства, адсочванне парушэнняў правоў чалавека, падтрымка працэсу выбараў [4].

На Стамбульскім саміце НАТА, які пачаўся адразу пасля сустрэчы ў Ірландыі, дыскусіі працягнуліся. Яны тычыліся ўдзелу вайскоўцаў еўрапейскіх краін у аднаўленні Ірака. На гэты раз абмяркоўвалася праблема падрыхтоўкі іракскіх войскаў з дапамогай спецыялістаў НАТА. Але нават гэтае пытанне выклікала дыскусіі на саміце паміж прадстаўнікамі Злучаных Штатаў і Францыі. У той час як французы згаджаліся ажыццявіць падрыхтоўку па-за межамі Ірака, амерыканцы настойвалі на правядзенні яе ўнутры краіны. Акрамя таго, Германія і Францыя заблакавалі ініцыятыву Злучаных Штатаў і Вялікабрытаніі па накіраванні міратворчага кантынгенту НАТА ў Ірак [2].

Яшчэ раней, згодна з дырэктывай прэзідэнта ЗША ад траўня 2004 года, пад эгідай Злучаных Штатаў было створанае Шматнацыянальнае камандаванне па перападрыхтоўцы сіл бяспекі Ірака (Multi-National Security Transition Command – Iraq, MNSTC-I), у рамках якога адбывалася падрыхтоўка іракскіх сіл бяспекі ваеннымі з тых краін, якія падтрымалі ваенную аперацыю. Уласна місія НАТА па падрыхтоўцы ўзброеных сіл Ірака (NATO Training Mission – Iraq, NTM-I) пачала дзейнічаць са снежня 2004 года [5, p. 6–9]. Унутры Ірака гэтую задачу выконвалі кантынгенты з тых краін, якія падтрымлівалі амерыканскі праект місіі. Тыя краіны, што не згадзіліся з гэтым варыянтам, праводзілі падрыхтоўку па-за межамі Ірака. Некаторыя краіны, напрыклад, Германія, заключылі асобныя двух- і шматбаковыя дамовы з іракскім кіраўніцтвам аб трэніроўцы яго сіл бяспекі. Такім чынам, раскол паміж членамі трансатлантычнай супольнасці пераадолець не ўдалося, і для падрыхтоўкі іракскіх узброеных сіл

выкарыстоўваліся розныя фарматы.

Дыскусійным заставалася пытанне аб удзеле краін ЕС у маніторынгу выбараў у Іраку ў 2005 годзе. Злучаныя Штаты імкнуліся заахвоціць еўрапейскія краіны прыняць у гэтым мерапремстве актыўны ўдзел у якасці назіральнікаў. Але ўдзел прадстаўнікоў ЕС аказаўся вельмі сціплым. Ва ўсіх трох выпадках Еўрапейская камісія вылучала абмежаваную суму грошай (20–30 млн еўра) і накіроўвала яе праз інстытуты ААН. Непасрэдны ўдзел еўрапейскіх назіральнікаў аказаўся вельмі неактыўным: на выбары ў студзені непасрэдна прыбылі толькі тры прадстаўнікі ЕС. Еўрапейцы тлумачылі гэта недастатковымі ўмовамі бяспекі ў дзяржаве.

Савет Еўрапейскага саюза ў лютым 2005 года прыняў рашэнне аб разгортванні ў Іраку Інтэграванай прававой місіі EUJUST LEX. З 9 сакавіка ўжо меркавалася пачаць планавую фазу, а з 1 ліпеня – практычную. Чакалася, што ў рамках аперацыі краіны ЕС будуць трэніраваць іракскіх службовых асоб: паліцэйскіх і суддзяў (усяго за год каля 770 чалавек) [7, p. 5]. Спачатку ў аперацыі прынялі ўдзел у асноўным краіны Заходняй Еўропы, потым – і новыя члены ЕС. Першапачаткова планавалася, што місія працягнецца адзін год, да 30 чэрвеня 2006 года, але потым тэрмін заканчэння некалькі разоў адкладваўся яшчэ на год. Гэты праект аказаўся паспяховым і падтрыманым у Еўрапейскім саюзе.

У верасні 2005 года ў Нью-Ёрку была падпісаная Сумесная дэкларацыя ЕС і Ірака аб палітычным дыялогу [3]. Нягледзячы на тое, што Еўрапейскі саюз пачаў ажыццяўляць уласныя праекты ў Іраку, амерыканцы працягвалі пільна сачыць за працэсам, не выпускаючы ініцыятыву са сваіх рук. У той жа час сувязі новага ўрада Ірака і Злучаных Штатаў былі настолькі шчыльныя, што нейкай іншай сіле перахапіць у амерыканцаў пазіцыі лідэра проста не мелася магчымасцей.

Такім чынам, па-першае, ступень уцягнутасці еўрапейскіх краін у працэс аднаўлення Ірака аказалася нераўнамернай. У той час як Вялікабрытанія выдаткоўвала вялікія сродкі і актыўна ўдзельнічала ў працэсе з самага пачатку, Францыя першапачаткова байкатавала нават аднаўленчыя мерапрыемствы і толькі паступова пачала падключацца пасля таго, як скончыліся спробы амерыканцаў прыцягнуць НАТА ў Ірак. Па-другое, трэба адзначыць першапачатковую слабую ўцягнутасць ЕС у цэлым у аднаўленчыя працэсы ў Іраку, што было звязана з нежаданнем буйнейшых донараў супольнасці – Францыі і Германіі – выдаткоўваць сродкі, таму сумы, якія прапаноўвалі еўрапейцы ў цэлым, на фоне выдаткаў Злучаных Штатаў выглядалі няўразліва. Сітуацыя ў цэлым змянілася з 2005 г., калі ў Іраку пачала працаваць прававая інтэграваная місія ЕС, былі падпісаныя дакументы, якія пачалі юрыдычнае афармленне адносін ЕС з новым іракскім урадам. З гэтага

часу ЕС стаў актыўна развіваць эканамічныя адносіны з Іракам і выдаткаваў нямалыя сумы на яго аднаўленне, што цалкам упісваецца ў еўрапейскую палітыку ўмацавання сваіх пазіцый у блізкаўсходнім рэгіёне. У той жа час пазіцыя Злучаных Штатаў заключалася ў тым, каб максімальна ўцягнуць свайго бліжэйшага саюзніка ў ажыццяўленне праектаў па аднаўленні, дзе самі амерыканцы мелі абмежаваныя магчымасці і матэрыяльныя цяжкасці пры выкананні гэтага выключна ўласнымі сіламі. Але пры гэтым ЗША імкнуліся не страціць свае пазіцыі і не выпусціць стратэгічную ініцыятыву ў краіне і рэгіёне ў цэлым, што вымушала іх уносіць пэўныя карэктывы ў сваю палітыку.

**Літаратура**


1. A Framework for EU-Iraq Engagement [Electronic Resourse]. – Mode of access: http://europa.eu/legislation_summaries/external_relations/relations_with_third_countries/middle_east/r16005_en.htm. – Date of access: 04.06.2010.
2. Deep Divisions over Iraq at NATO's Istanbul Summit // Disarmament Diplomacy [Electronic Resourse]. – Issue No. 78. – July/August 2004. – Mode of access: http://www.acronym.org.uk/dd/dd78/78news01.htm. – Date of access: 04.06.2010.
3. EU-Iraq Joint Declaration on Political Dialogue. Brussels, 2005.
4. EU-U.S. Declaration of Support for the People of Iraq. Dromoland Castle, 2004.
5. Iraq: Foreign Contributions to Stabilization and Reconstruction. Congressional Research Service, RL32105, 2007.
6. Iraq: Madrid Donor Conference // Council on Foreign Relations [Electronic Resourse]. – Mode of access: www.cfr.org/publication/7682/iraq.html. – Date of access: 04.06.2010.
7. Launching of EUJUST LEX, ESDP Integrated Rule-of-Law Mission for Iraq. Brussels, General Secretariat of the Council of the European Union, 2005.


## ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯЦЕЙ-СІРОТ НА АКУПІРАВАНЫХ ПОЛЬСКІМІ ВОЙСКАМІ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1919–1920 ГАДАХ


**В. М. Бароўская**


Хаас часу, вядзенне ваенных дзеянняў на беларускіх землях, складанасці эканамічнага характару выклікалі шматлікія сацыяльныя праблемы. Грамадства, якое за гады вайны звыклася з бесчалавечнымі адносінамі, сітуацыяй, калі чалавечае жыццё каштавала вельмі танна, або наогул нічога не каштавала; з абыякавасцю навакольнага асяроддзя да сваёй асобы, безабароннасцю, з шматлікімі складанасцямі матэрыяльнага забеспячэння. У такой сітуацыі праблемы дзяцей-сірот проста ігнараваліся, ці вырашаліся ў абмежаваным маштабе. Між тым сітуацыя страты бацькоў (у выніку вядзення ваенных дзеянняў, з-за распаўсюджанасці вострых эпідэмных захворванняў сярод насельніцтва і па іншым прычынам) была распаўсюджанай з’явай.

Савецкая ўлада з-за недахопу сродкаў фінансавання, неабходнага часу